УДК 316.77;070

***С.В. Венідзіктаў***
*канд. філал. навук, дац., нач. каф. сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь*
e-mail: tv.lab.mogilev@gmail.com

# ГРАМАДСКАЕ ВЯШЧАННЕ Ў МЕДЫЯПРАСТОРЫ ЕЎРАЗІЙСКАГА ЭКАНАМІЧНАГА САЮЗА

*У артыкуле даследуецца актуальны стан медыйнай прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза ў крытычна важнай для інтэграцыі сферы грамадскага вяшчання. Паказана, што класічная еўрапейская мадэль грамадскіх СМІ не рэалізавана ні ў адной з дзяржаў ЕАЭС, што абумоўлена адсутнасцю заканадаўчых норм, якія рэгулююць іх стварэнне і дзейнасць, а таксама недахопам структур кіравання, схільнымі да маніпуліравання крыніцамі фінансавання, павольным рэфармаваннем праграмнай палітыкі. Дыгіталізацыя, канвергенцыя камунікацыйных тэхналогій, канкурэнцыя з боку камерцыйных кампаній змушаюць да перагляду спецыфічных функцый такога тыпу СМІ ў новых абставінах. Сцвярджаецца, што адным з вынікаў неразвітасці грамадскага вяшчання ў Арменіі, Беларусі, Расіі, Казахстане і Кыргызстане з'яўляецца камунікацыйны разрыў паміж уладай і грамадзянамі.*

## Уводзіны

Эвалюцыя інтэграцыйных працэсаў у Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕАЭС) заканамерна прыводзіць да актуалізацыі пытання аб неабходнасці фарміравання адзінай медыяінфармацыйнай прасторы. Пры гэтым важным фактарам эфектыўнага развіцця апошняй з'яўляецца стварэнне асяроддзя свабоднага распаўсюджвання інфармацыйных плыняў дзяржаў-партнёраў. У Індэксе ўстойлівасці СМІ (2016 г.) вылучаюцца пяць базавых прынцыпаў функцыянавання аптымальнай медыякамунікацыйнай сістэмы:

1) наяўнасць прававых і сацыяльных норм абароны свабоды слова і гарантый доступу да грамадска значнай інфармацыі;

2) адпаведнасць журналісцкай дзейнасці прафесійным стандартам якасці;

3) множнасць крыніц дакладнай і аб'ектыўнай інфармацыі;

4) эфектыўны менеджмент СМІ, які забяспечвае рэдакцыйную незалежнасць;

5) наяўнасць грамадскіх інстытутаў, якія падтрымліваюць прафесійныя і незалежныя СМІ [1, с. 21].

Эфектыўнасць медыякамунікацыі ў соцыуме пры гэтым уводзіцца ў непасрэдную залежнасць ад арганізацыйных форм дамінуючых СМІ, сярод якіх вылучаюць асноўныя: 1) дзяржаўная манаполія; 2) прыватнае валоданне, якое звычайна суправаджаецца дзяржаўным рэгуляваннем; 3) грамадская манаполія, пры якой СМІ непасрэдна не падпарадкоўваюцца ўладзе.

Зыходзячы з таго, што ні дзяржаўныя (нават тыя, што абслугоўваюць грамадскія патрэбы), ні камерцыйныя СМІ не могуць цалкам служыць патрэбам медыякамунікацыйнай інтэграцыі, найбольш перспектыўным напрамкам у кантэксце эвалюцыі еўразійскай прасторы нам уяўляецца развіццё грамадскага вяшчання, не падкантрольнага ні дзяржаве, ні рынку. Такім чынам, мэтай дадзенай працы з'яўляецца даследаванне актуальнага стану медыйнай прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза ў крытычна важнай для інтэграцыі сферы грамадскага вяшчання. Пры гэтым вырашаецца задача вызначэння перспектыўных напрамкаў эвалюцыі медыйнай сістэмы дзяржаў-партнёраў, якая ва ўмовах паскоранага развіцця міждзяржаўнага ўзаемадзеяння кампенсуе прабелы ў сістэме палітычнай камунікацыі.

Ідэя грамадскага доступу да СМІ выказвалася яшчэ ў 1960-х гг.: «Заснаваныя грамадствам некамерцыйныя і юрыдычна гарантаваныя інстытуты грамадзянскай супольнасці, якія працуюць добраахвотна і падсправаздачныя сваім аўдыторыям з дапа-

могай дэмакратычных працэдур, з'яўляюцца істотным складнікам мадэлі грамадскага абслугоўвання» (пераклад наш. – *С. В.*) [2, с. 123]. Існаванне ва ўмовах трансфармацыі свабодных СМІ, скіраваных на фарміраванне грамадскай думкі, развіццё структур грамадзянскай супольнасці, спрыяе эфектыўнай пабудове дэмакратычных інстытутаў. І калі ў сталай дэмакратыі свабодныя, незалежныя СМІ могуць узнікаць натуральным чынам, то ў многіх пераходных грамадствах неабходны меры для стымулявання дадзенага працэсу. У такой сітуацыі адным са шляхоў эфектыўнага рэфармавання медыясістэмы з'яўляецца еўрапейская мадэль грамадскіх каналаў, якая прадвызначае ступень узаемапранікнення камунікацыйных працэсаў грамадзянскай супольнасці і палітычнай эліты.

Адпаведны еўрапейскай мадэлі грамадскіх каналаў тып журналістыкі на першае месца ставіць не рэдакцыйную палітыку, а абавязкі СМІ перад грамадствам (у ЗША нават распаўсюджана паняцце public journalism – «грамадская журналістыка»). Грамадскае вяшчанне вядзе дзейнасць незалежна ад эканамічнай і палітычнай улады, забяспечваючы соцыум інфармацыйнымі, культурнымі, адукацыйнымі праграмамі, спрыяючы росту сацыяльнай, палітычнай і культурнай актыўнасці грамадзян. Падобныя характарыстыкі дазваляюць разглядаць грамадскія СМІ ў якасці дзейснага фактару медыякамунікацыйнай інтэграцыі ў ЕАЭС. Грамадскае вяшчанне з'яўляецца «ўніверсальным з пункту гледжання зместу і доступу, гарантуе рэдакцыйную незалежнасць, прапануе мноства праграм і паслуг, якія задавальняюць запыты ўсіх груп насельніцтва, і нясе адказнасць перад усім грамадствам» (пераклад наш. – *С. В.*) [3].

У тым ці іншым выглядзе падобны тып СМІ прысутнічае у больш чым 40 краінах (Аўстралія, ЗША, Канада, Германія, Швецыя, Нарвегія, Польшча, Японія і інш.). У краінах Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы працэс фармальнага пераўтварэння дзяржаўных СМІ ў грамадскія, распачаты пасля 1990 г., за нешматлікімі выключэннямі, завершаны. Напрыклад, у 2015 г. была створана Нацыянальная грамадская тэлерадыёкампанія Украіны, а таксама назіральны савет пры ёй. У 2012 г. Дзяржаўнай Думай Расійскай Федэрацыі быў разгледжаны законапраект аб стварэнні грамадскага вешчання.

**Еўразійская інтэграцыя і грамадскае вяшчанне**

Як паказвае вопыт еўрапейскага інфармацыйнага ўзаемадзеяння, а таксама дзейнасць міждзяржаўных СМІ ў СНД і Саюзе Беларусі і Расіі, менавіта грамадскае вяшчанне валодае найбольшым інтэграцыйным патэнцыялам у міждзяржаўных структурах. Асаблівую актуальнасць дадзенае пытанне набыло ў кантэксце інфармацыйнай інтэграцыі дзяржаў ЕАЭС: Арменіі, Беларусі, Расіі, Казахстана і Кыргызстана. Важную ролю ў разуменні значэння грамадскага вяшчання як інтэграцыйнага рэсурсу адыграў вопыт узамеадзеяння ў фармаце СНД: «Няўдачы ў эканамічнай і палітычнай інтэграцыі яшчэ раз пераканаўча прадэманстравалі ўсім удзельнікам СНД праваты ісціны: кожнаму чарговаму кроку ў наладжванні міжнароднага інтэграцыйнага або кааперацыйнага супрацоўніцтва ў той ці іншай сферы павінна папярэднічаць рашэнне праблем інфармацыйна-медыйнага забеспячэння гэтага кроку» (пераклад наш. – *С. В.*) [4]. Стварэнне еўразійскага грамадскага інфармацыйнага канала стала адной з прапаноў, выказаных удзельнікамі дыскусіі па інфармацыйнай палітыцы ў ЕАЭС, якая адбылася ў 2016 г. у Інтэграцыйным клубе пры старшыні Савета Федэрацыі Расійскай Федэрацыі. Неабходнасць стварэння адзінай інфармацыйнай прасторы ў ЕАЭС, а ў яго структуры – грамадскага вяшчання, была прызнана і ўдзельнікамі VIII Форуму еўрапейскіх і азіяцкіх медыя (ФЕАМ–2015).

З улікам таго, што ЕАЭС пазіцыянуецца як аб'яднанне эканамічнае, а не палітычнае, у яго рамках цалкам можа быць рэалізавана заходняя мадэль грамадскага вяшчання. Усе нацыянальныя мадэлі грамадскага вяшчання маюць 4 інтэгральныя фактары:

1) заканадаўчая база (Каралеўская хартыя ў Велікабрытаніі; Закон аб грамадскім вяшчанні ў ЗША і г.д.); 2) кантроль з боку грамадзянскай супольнасці; 3) фінансаванне, якое выключае магчымасць камерцыялізацыі; 4) максімальнае задавальненне аўдыторных інтарэсаў. Агульныя прыкметы, уласцівыя грамадскаму вяшчанню, па-рознаму рэалізуюцца ў дзяржавах ЕАЭС.

У Арменіі грамадскае вяшчанне ў большай ступені, чым у іншых дзяржавах ЕАЭС, адпавядае «класічнай» мадэлі. Заканадаўчыя асновы яго функцыянавання выкладзены ў Законе Рэспублікі Арменіі «Аб тэлебачанні і радыё», у якім пазначана, што такі тып СМІ заклікаfirst ў першую чаргу забяспечваць канстытуцыйныя правы грамадзян: «правы свабодна атрымліваць палітычную, эканамічную, адукацыйную, культурную, дзіцяча-юнацкую, навукова-асветніцкую інфармацыю, інфармацыю аб армянскай мове і гісторыі, спартыўную, забаўляльную і іншую важную і значную для грамадства інфармацыю» (пераклад наш. – *С. В.*) [5]. Грамадскае тэлебачанне Арменіі «Айлур 1» з 2000 г. працуе ў Аўстраліі, ЗША і Канадзе. У цяперашні час міжнародны канал «Armenia 1» вяшчае па ўсім свеце. З 2007 г. дзейнічае другі канал Грамадскага тэлебачання «Ararat», арыентаваны на культурны кантэнт.

Аднак, як паказвае аналіз арт. 28 Закона «Аб тэлебачанні і радыё» [5], патрабаванні да праграмнай палітыкі грамадскіх вяшчальнікаў у Арменіі практычна не адрозніваюцца ад агульных рэкамендацый, актуальных для СМІ іншых форм уласнасці. Незалежны маніторынг, праведзены кампаніяй BBC, паказаў, што больш за палову вяшчання канала «Айлур 1» адводзіцца забаўляльным праграмам, арыентаваным на атрыманне прыбытку. З аднаго боку, арыентацыя на запыты масавай аўдыторыі дазваляе каналу захоўваць высокія рэйтынгі, з другога – супярэчыць задачам грамадскага канала. Інфармацыйна-аналітычны кантэнт «Айлур 1» складае каля 15 % вяшчання, уключаючы ў сябе выпускі навін, аналітычныя рэпартажы, сацыяльна-палітычныя праекты, праграмы аб працы парламента. Яшчэ каля 35 % праграмнай структуры займаюць культурна-асветніцкія праекты [6].

Сярод прынцыпаў вяшчання Грамадскага тэлебачання Арменіі – адказнасць у выбары матэрыялу, патрабаванне да чысціні мовы, разнастайнасць тэматыкі, фарміраванне эфірнай палітыкі з улікам адрозненняў у рэгіянальных аўдыторыях (гарадскія/сельскія раёны, тэрыторыя Арменіі/замежжа). Грамадскае радыё Арменіі распаўсюджвае грамадска-палітычныя, інфармацыйныя, культурна-забаўляльныя, спартыўныя і музычныя праекты ў частотным радыёэфіры, праз кабельную радыёсетку, Інтэрнэт і спадарожнікавае вяшчанне. Для радыё характэрны рэжым мультыкультурнай талерантнасці: вяшчанне вядзецца на 15 мовах, уключаючы мовы нацыянальных меншасцей. У краіне дзейнічае Савет грамадскага тэлебачання і радыё, а таксама Савет грамадскага тэлебачання, у склад якіх уваходзяць аўтарытэтныя ў сферы СМІ асобы.

Нягледзячы на фармальную адпаведнасць рэдакцыйнай палітыкі грамадскіх вяшчальнікаў Арменіі агульным стандартам падобнага тыпу СМІ, прынятым у еўрапейскіх дзяржавах, нельга весці размову аб іх сапраўднай незалежнасці: арт. 35 Закона «Аб тэлебачанні і радыё» [5] прама прадугледжвае механізм дзяржаўнага фінансавання, што мае на ўвазе ўскосную падсправаздачнасць ураду. Да таго ж, у Арменіі, нягледзячы на заканадаўчую забарону для палітычных партый валодаць тэлевізійнымі каналамі, найбольш уплывовыя вяшчальнікі дэ-факта кантралююцца палітычнымі коламі. Напрыклад, агульнанацыянальны канал «Еркір Медыя ТБ», звязаны з Армянскай рэвалюцыйнай федэрацыяй (нацыяналістычная партыя з сацыялістычнымі поглядамі). Тэлеканал «Кентрон ТБ», вядомы сваімі палітычнымі праектамі, апасродкавана кантралюецца кіраўніцтвам партыі «Квітнеючая Арменія». Канал «Арарат ТБ» звязаны з кіруючай «Рэспубліканскай партыяй Арменіі».

Арганізацыя Human Rights Watch у апублікаванай у пачатку 2016 г. справаздачы выказала таксама занепакоенасць пераходам Арменіі на лічбавае вяшчанне [7]: новы фармат з'яўляецца недаступным для рэгіянальных вяшчальнікаў, што ў перспектыве прывядзе да яшчэ большай цэнтралізацыі масавай інфармацыі і да зніжэння індэксу свабоды слова ў краіне.

Як і ў Арменіі, у Расійскай Федэрацыі грамадскае тэлебачанне падсправаздачна ўраду, больш за тое, акрамя механізму фінансавання, прадугледжаны і напаўдзяржаўныя кіруючыя структуры. Урад як заснавальнік ГТР (ОТР) – грамадскага тэлебачання Расіі – фармальна перадае кіруючыя функцыі Наглядальнаму савету, генеральнаму дырэктару, рэвізійнай камісіі і Савету па выкарыстанні мэтавага капіталу, кантрольныя функцыі – Савету па грамадскім тэлебачанні [8]. Класічная трыяда В. Румпхорста, якая апісвае «ідэальнае» грамадскае вяшчанне (фінансаванне грамадствам, кантроль з боку грамадства, служэнне інтарэсам грамадства), у Расіі не рэалізуецца ў поўным аб'ёме, што прадвызначае дыскусію ў акадэмічным асяроддзі па пытанні «Ці лічыць расійскае грамадскае вяшчанне грамадскім?». ГТР можна разглядаць як грамадска значны федэральны інфармацыйны праект, які задавальняе патрэбы шырокіх аўдыторных груп у сацыяльна значнай інфармацыі, аднак пазбаўлены дзейсных механізмаў удзелу грамадзян у фарміраванні праграмнай палітыкі, а таксама фінансавай самадастатковасці. У межах існуючага прававога поля, эканамічных і медыйных рэалій трансфармацыя грамадскага вяшчання Расіі ў яго еўрапейскую разнавіднасць не ўяўляецца дасягальнай. Напрыклад, пасля першага году працы, калі былі атрыманы бюджэтныя 20 млрд руб. на развіццё вяшчання, ГТР сутыкнулася з праблемай збору сродкаў ад грамадскасці (за год было сабрана толькі 50 тыс. руб.) [9].

Разгледжаны ў Расіі яшчэ ў 2012 г. законапраект аб стварэнні грамадскіх СМІ выклікаў шэраг пытанняў і прэтэнзій сярод спецыялістаў, знаёмых з сусветнай практыкай функцыянавання грамадскіх вяшчальных службаў, а таксама паказаў адсутнасць цікавасці з боку шараговых грамадзян: «У Расіі выразна праявіліся сацыяльная інэртнасць, дэфіцыт грамадзянскасці… У выніку рашэнне аднаго з найважнейшых пытанняў, якое вызначае далейшы стан медыясферы краіны яе магчымае аздараўленне, было пакінута грамадзянскай супольнасцю на водкуп дзяржчыноўнікам з уласцівым ім менталітэтам і інтарэсамі» (пераклад наш. – *С. В.*) [10, с. 83].

Тэлеканал «Расія – Культура», блізкі па канцэпцыі вяшчання грамадскаму, такім таксама не з'яўляецца з прычыны дзяржаўнага фінансавання і вузкасці праграмнай палітыкі. У 2011–2012 гг. у Расіі была спроба арганізацыі Сеткавага грамадскага тэлебачання, ідэі якога ўтрымліваліся ў Хартыі грамадскага тэлебачання (2011 г.), аднак пасля прэзідэнцкіх выбараў 2012 г. праект быў спынены. З 2012 г. праваабарончая арганізацыя «За правы чалавека» ажыццяўляе інтэрнэт-трансляцыю тэлеканала «Аб'яднанае грамадзянскае тэлебачанне»; канал арыентаваны на пашырэнне прыкладаў грамадзянскай актыўнасці насельніцтва і барацьбу за грамадзянскія правы, што адпавядае патрэбам дэмакратычнага грамадства, але звужае аўдыторыю (грамадскае вяшчанне павінна быць арыентавана на максімальна шырокі ахоп грамадзян). У Санкт-Пецярбургу дзейнічае грамадска-палітычны інфармацыйны тэлеканал кругласутачнага вяшчання ВОТ (ВГТ – «Ваша грамадскае тэлебачанне»), для якога характэрны інтэрактыўнасць, вострая дыскусійнасць і арыентацыя на палітычны дыскурс.

У такой сітуацыі ролю грамадскага тэлебачання ў Расіі выконвае «неграмадскі» прыватны вяшчальнік «Дождж» (кругласутачны інфармацыйны тэлеканал, вядомы незалежнай пазіцыяй у асвятленні пратэстнага руху ў Расіі 2011–2013 гг., «Балотнай справы» і іншых вострых палітычных падзей). У дачыненні да «Дажджу» ўпершыню ў расійскай медыйнай практыцы быў рэалізаваны механізм грамадскага фінансавання: у 2014 г., калі праз фінансавыя цяжкасці ўзнікла пагроза закрыцця каналу, быў абвеш-

чаны тыднёвы марафон «Падтрымай дождж!», сродкаў ад якога хапіла на вяшчанне працягам 50 сутак [11]. У першай палове 2015 г., калі з-за ўнясення паправак у расійскае медыйнае заканадаўства канал пазбавіўся рэкламнага бюджэту, «Дождж» практычна цалкам фінансаваўся за кошт аўдыторыі.

Сітуацыя з грамадскім вяшчаннем на медыйным рынку Расіі, такім чынам, характарызуецца наяўнасцю значных супярэчнасцей: СМІ гатовы працаваць у новым фармаце, аўдыторыя гатова фінансаваць сацыяльна значныя інфармацыйныя праекты, аднак дзяржавай не створаны эфектыўны механізм (у першую чаргу, у прававой і ў палітычнай сферах), які дазволіў бы аб’яднаць гэтыя тэндэнцыі.

Калі ў Арменіі і Расіі існуе нагода для дыскусіі, ці лічыць асобныя СМІ грамадскімі, то ў Беларусі такая дыскусія не ўяўляецца магчымай. Развіццё грамадскіх СМІ ў рэспубліцы шмат у чым стрымліваецца адсутнасцю заканадаўчых норм, якія рэгулююць стварэнне і дзейнасць падобных медыя, г.зн. іх прававой базы, механізмаў кіравання і фінансавання, асноўных прынцыпаў фарміравання праграмнай палітыкі (актыўны ўдзел аўдыторыі). У Законе «Аб сродках масавай інфармацыі» не згадваюцца грамадскія функцыі журналістаў і СМІ, гарантыі рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на доступ да інфармацыі. Незалежныя СМІ ў рэспубліцы нешматлікія, ні ў адным з медыйных сектараў у цяперашні час мы не можам казаць аб наяўнасці СМІ, тыпалагічна блізкіх да грамадскіх.

У Казахстане стварэнне паўнавартаснага грамадскага вяшчання таксама не ўяўляецца магчымым у бліжэйшай перспектыве, што абумоўлена дзяржаўнай манапалізацыяй сферы масавай інфармацыі, вузкасцю рэкламнага рынку, спецыфічным характарам узаемадзеяння СМІ і аўдыторыі. У 2012 г. ініцыятыва стварэння ў краіне грамадскага тэлебачання, якое дало б магчымасць быць пачутымі арганізацыям трэцяга сектару, была разгледжана ў парламенце, аднак практычных мер рэалізавана не было. Казахстанскі тэлеканал «Еўразія» ў асноўным запаўняе эфір расійскім кантэнтам, захоўваючы ў інфармацыйных праграмах пазіцыі і ацэнкі Расіі ў дачыненні да сусветных падзей. Канал «Казахстан», арыентаваны на нацыянальную мову і мясцовы медыйны прадукт, карыстаецца папулярнасцю ў слаба ўрбанізаваных раёнах. Зараз функцыю, аналагічную расійскаму каналу «Дождж», у Казахстане выконвае кругласутачны тэлеканал навін «24 KZ», вяшчанне якога з’яўляецца найбольш аператыўным і аб’ёмным з пазіцыі фарміравання парадку дня, аднак не адрозніваецца вастрынёй і дыскусійнасцю закранаемых тэм.

У Кыргызстане грамадская мадэль вяшчання, якая рэалізуецца з 2011 г., калі быў прыняты Закон «Аб Грамадскай тэлерадыёвяшчальнай карпарацыі Кыргызскай Рэспублікі» (ГТРК), таксама мае нацыянальныя асаблівасці. ГТРК зараз аб’ядноўвае тэлеканалы «Баластан», «Музыка», «Общественный первый канал», «Маданият», «Спорт», радыёстанцыі «Киргизав Радиосу», «Биринчи Радио», «Мин Кыял FM», «Түнкү белявыми», «Балдар FM», «Достук радио», а таксама Рэспубліканскі радыётэлецэнтр і студыю «Кыргызтелефильм», што робіць яе найбольш значным удзельнікам рынку СМІ краіны. Пры ГТРК з 2014 г. функцыянуе Рэспубліканскі вучэбны цэнтр медыякамунікацыі, які рыхтуе спецыялістаў-практыкаў для працы ў СМІ. Фінансуецца ГТРК пераважна са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а не за кошт грамадскіх узносаў і ахвяраванняў, што не дазваляе казаць пра яе як пра «традыцыйнага» грамадскага вяшчальніка. Як паказана ў справаздачы за 2015 г. праваабарончай арганізацыі Freedom House, «падчас перадвыбарчай кампаніі ГТРК моцна прасоваў прэзідэнцкую партыю СДПК, у той час як дзейнасць іншых партый асвятлялася мала, а калі асвятлялася, часта ў неспрыяльным ракурсе… Хоць канал стаў празрысцей, ён не дасягнуў аб’ектыўнай журналістыкі і не падае крытычных пазіцый у дачыненні да палітыкі ўрада» (пераклад наш. – *С. В.*) [12].

Яшчэ адзін тэлевізійны праект, які прэтэндуе на статус грамадскага, рэалізуецца ў Кыргызстане з 2007 г.: канал ЭлТР, які першапачаткова меў статус абласнога, цяпер прапануе 17 гадзін грамадска-палітычнага, культурнага і адукацыйнага вяшчання ў суткі (пераважна на нацыянальнай мове). Зыходзячы з таго, што аднымі з асноўных задач грамадскага вяшчання Кыргызстана названы фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы рэспублікі, а таксама распаўсюджванне максімальна аб'ектыўнай інфармацыі аб унутранай і знешняй палітыцы дзяржавы, дадзены медыярэсурс правамерна разглядаць у якасці найбольш перспектыўнай платформы інфармацыйнай інтэграцыі Кыргызстана ў прастору ЕАЭС.

**Заключэнне**

Цяжкасці ў стварэнні сістэмы грамадскага вяшчання ў дзяржавах Еўразійскага эканамічнага саюза, на наш погляд, з'яўляюцца заканамернымі. Сучасным грамадскім вяшчальнікам усё цяжэй апраўдаць сваё існаванне ў медыясяроддзі і палітычнай сістэме, а таксама данесці сэнс сваёй місіі да аўдыторыі. Складанасці, з якімі яны сутыкаюцца, – вынік недахопу структур кіравання, неадэкватных і (або) схільных да маніпулявання крыніц фінансавання, занадта павольнага рэфармавання праграмнай палітыкі. Дыгіталізацыя, канвергенцыя камунікацыйных і інфармацыйных тэхналогій, а таксама канкурэнцыя з боку камерцыйных кампаній змушае да перагляду спецыфічных функцый такога тыпу СМІ ў новых абставінах. Цяпер грамадскае вяшчанне «еўрапейскага тыпу» перажывае «крызіс ідэнтычнасці», наступленне камерцыйных каналаў змушае каналы грамадскія ўступаць у «вайну за рэйтынгі». Ва ўмовах адсутнасці грамадскага вяшчання і абмежаванасці ўплыву незалежных СМІ ў дзяржавах ЕАЭС атрымліваюць развіццё платформы грамадзянскай журналістыкі, якія функцыянуюць у выглядзе як самастойных анлайн-праектаў (напрыклад, расійскія Noga-TV.com, ARU TV і інш.), так і ініцыятыў у сацыяльных сетках. Усе яны характарызуюцца імкненнем адлюстроўваць той бок сацыяльнай рэальнасці, якая адсутнічае ў дзяржаўных медыя, апазіцыйнасцю да афіцыйнай палітыкі і арыентацыяй пераважна на ўнутрыдзяржаўныя праблемы. Пытанні еўразійскай інтэграцыі ў еўразійскай грамадзянскай журналістыцы не з'яўляюцца прыярытэтнымі.

Такім чынам, адсутнасць сістэмнасці ў падачы інтэграцыйнай тэматыкі ў рэгіянальных і нацыянальных СМІ дзяржаў ЕАЭС, а таксама адсутнасць умоў для развіцця грамадскіх медыя, паглыбляе камунікацыйны разрыў паміж уладай і грамадзянамі ў еўразійскай медыйнай прасторы. У выніку медыясфера ў супастаўленні са сферамі эканомікі і палітыкі застаецца найменш інтэграванай вобласцю міждзяржаўнага ўзаемадзеяння. На наш погляд, вырашэнне перспектыўнай задачы стварэння адзінай інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы ў межах ЕАЭС як найважнейшага фактару эвалюцыі палітычнай камунікацыі, залежыць у тым ліку ад пашырэння магчымасцей для развіцця грамадскіх (альбо тыпалагічна блізкіх да іх) медыярэсурсаў. Узгодненыя крокі дзяржаў ЕАЭС павінны закранаць заканадаўчую сферу, забяспечваць інтэграцыю на ўзроўні структур грамадзянскай супольнасці, садзейнічаць сіметрычнай эвалюцыі медыякампетэнтнасці еўразійскай аўдыторыі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Media Sustainability Index 2016. The Development of Sustainable Independent Media in Europe and Eurasia. – Washington : IREX, 2016. – 344 p.

2. Keane, J. Global Civil Society? / J. Keane. – Cambridge, 2003. – 206 p.

3. Об общественном вещании [Электронный ресурс] : рекомендация 1641 (2004) Парламентской Ассамблеи Совета Европы / Ин-т проблем информ. права. – Режим

доступа: http://www.medialaw.ru/laws/ other_laws/european/rec1641-2004.htm. – Дата доступа: 18.02.2017.

4. Косикова, Л. Регион СНГ во внешнеэкономической стратегии России / Л. Косикова // Россия и соврем. мир. – 2010. – № 4. – С. 107–123.

5. О телевидении и радио [Электронный ресурс] : Закон Респ. Армения // Парламент Республики Армения : официал. сайт. – Режим доступа: http://www.parliament.am/legislation.php?sel=show&ID=1464&lang=rus. – Дата доступа: 24.01.2017.

6. Абашина, Е. В. Актуальные тенденции в эфире общественного телевидения Закавказья: сравнительный анализ особенностей программной политики телеканалов «Ичтимаи ТВ» (Азербайджан), «Айлур 1» (Армения) и «Пирвели архи» (Грузия) в 2011 г. и 2014 г. [Электронный ресурс] / Е. В. Абашина // Медиаскоп : электрон. науч. журн. фак. журналистики МГУ им. М. В. Ломоносова. – Режим доступа: http://www.mediascope.-ru/node/1767. – Дата доступа: 25.03.2016.

7. Freedom of Expression [Electronic source] // Human Rights Watch : official site. – Mode of access: https://www.hrw.org/world-report/2016/country-chapters/armenia#eaa21f. – Date of access: 17.02.2017.

8. Общественное телевидение России [Электронный ресурс] : устав АНО, 12.09.2012, № 1679-р. // Обществ. телевидение России : интернет-портал. – Режим доступа: http://www.otr-online.ru/resources/userFiles/documents/a1bc7d0b48.pdf. – Дата доступа: 27.01.2017.

9. Общественное телевидение – это чудо, его надо сохранить [Электронный ресурс] // Телеканал «Дождь» : официал. сайт. – Режим доступа: https://tvrain.ru/teleshow/here_and_now/obschestvennoe_televidenie_eto_chudo_ego_nado_sohranit_otr_smoglo_sobrat_tolko_50_tysjach_iz_20_millionov_rublej-361018/. – Дата доступа: 11.01.2017.

10. Короченский, А. П. Медиаобразование и формирование гражданственности россиян: проблемы и перспективы / А. П. Короченский // Современное состояние медиаобразования в России в контексте мировых тенденций : материалы междунар. науч. конф., Таганрог, 6–7 сент. 2012 г. / Рос. ин-т культурологии ; отв. ред. К. Э. Разлогов, А. В. Федоров. – М., 2012. – С. 82–86.

11. Марафон в поддержку Дождя [Электронный ресурс] // Телеканал «Дождь» : официал. сайт. – Режим доступа: https://tvrain.ru/sos/. – Дата доступа: 15.02.2017.

12. Свобода слова в Кыргызстане: почти все СМИ зависят от мнения власти [Электронный ресурс] // KYRGYZTODAY.KG : информ. портал. – Режим доступа: http://kyrgyztoday.kg/ru/?p=2617. – Дата доступа: 28.04.2016.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 24.04.2017

***Venidziktau S.V.*** **Public Broadcasting in the Media Space of the Eurasian Economic Union**

*The article examines the current state of the media space of the Eurasian Economic Union in the crucial integration field of public service broadcasting. It is shown that the classical European model of public media is not implemented in any of the EAEU states that due to the lack of legislation governing their creation and activity, as well as lack of management structures, prone to manipulating sources of funding, slow reform of the program policy. Dygitalization, the convergence of communication technologies, competition from commercial companies forced to revise the specific features of this type of media in the new circumstances. It is alleged that one of the results of the underdevelopment of public service broadcasting in Armenia, Belarus, Russia, Kazakhstan and Kyrgyzstan is a communication gap between government and citizens.*